УДК 821.161.3.09(092) Навуменка

**К. М. Чарота** (Мінск)

# СРОДКІ МАСТАЦКАЙ ВЫРАЗНАСЦІ Ў АПОВЕСЦЯХ І. НАВУМЕНКІ «СНЕЖАНЬ» І «РАЗВІТАННЕ Ў КАВАЛЬЦАХ»

У аповесці «Снежань» І. Навуменка ізноў звяртаецца да тэмы «сямнаццацігадовых» на вайне. Пісьменнік адлюстроўвае падзеі самага пачатку вайны, калі героі твора не ўсведамлялі яшчэ маштабу трагедыі. Ваенныя падзеі пайшлі

зусім не так, як многія аптымістычна меркавалі ў самым яе пачатку. Адступленне Чырвонай арміі, фашысцкая акупацыя сталі нечаканасцю для многіх, у тым ліку і герояў твора. Пацвердзіліся трывогі герояў аповесці: немцы набліжаліся да Масквы.

Гэтую аповесць можна назваць своеасаблівым працягам апавядання «Сямнаццатай вясной». Тыя ж самыя маладыя хлопцы толькі пад іншымі імёнамі нібы перайшлі з апавядання ў аповесць і пачынаюць рабіць першыя крокі ў падпольнай барацьбе. Толькі яны ўжо не майструюць самаробную міну для дыверсіі, як гэта было ў папярэднім апавяданні, а рамантуюць радыёпрыёмнік, каб ведаць, што робіцца на самой справе на фронце, друкуюць і распаўсюджваюць лістоўкі. Тэма сталення маладых людзей падчас вайны, асэнсоўвалася празаікам у непарыўнай сувязі з яго ўласнай біяграфіяй, у апавядальніку можна лёгка ўбачыць асобу самога аўтара. Ацэньваючы сітуацыю з вышыні свайго жыццёвага вопыту, і тут пісьменнік паказвае рамантычна-ўзнёслае імкненне да гераізму маладых людзей з несхаванай самаіроніяй: «*Збіраючыся, мы лаем фашыстаў апошнімі словамі, прарочым ім хуткую пагібель. Але немцам ад гэтага, здаецца, не вельмі баліць*» [6, с. 29].

На працягу ўсяго твора прасочваецца яўны канфлікт паміж жаданнямі, імкненнямі маладых людзей і іх рэальнымі магчымасцямі. Наколькі б моцна не хацелася героям аповесці «Снежань» зрабіць акупантам хоць нейкую шкоду, «*ўчапіцца ў іх горлы зубамі*», але «*зубамі фашыстаў, мабыць, не перадушыш*» [6, с. 30]. Як і ў сваіх ранніх апавяданнях, у гэтай аповесці «пісьменнік не засяроджваў увагу на драматычных падзеях, не шукаў выключна гераічных подзвігаў, а паказваў маладых людзей, падлеткаў і юнакоў такімі, якімі яны былі на самай справе: рамантычныя, не падрыхтаваныя да сур’ёзных выпрабаванняў» [4, с. 244–245]. У аповесцях І. Навуменка працягвае удасканальваць сваё майстэрства напісання пейзажных замалёвак. Для ўзмацнення драматызму сітуацыі і паглыблення ў атмасферу мастацкага твора пісьменнік дае падрабязныя малюнкі зімовай прыроды: «*На свеце быў снежань, сумны, бясснежны. Аднастайна і нудна гулі вечарамі тэлеграфныя слупы з абарванымі правадамі. Правады былі парваны не ўсе, два ці тры асталіся цэлыя і звінелі на марозе, як струны, перадаючы свой балючы сум мёрзламу дрэву слупоў. Правады былі мёртвыя... Мястэчка замёрзла, стаіўшыся ў змроку снежаньскай ночы*» [6, с. 29]. Дадзенае апісанне прыроды адпавядае агульнаму настрою герояў аповесці, у той час як у пейзажах апавядання «Сямнаццатай вясной» аўтар выкарыстоўваў прыём кантрасту прыроды з настроем галоўнага героя.

Апісанні знешняга выгляду і ўнутранага ўбранства вясковай хаты, у якой збіраліся маладыя хлопцы-падпольшчыкі для таго, каб змайстраваць радыё, з’яўляюцца важнымі элементамі для больш поўнага раскрыцця сюжэта ў аповесці «Снежань». Менавіта дзякуючы непрывабнаму і нават «*убогаму*» знешняму выгляду: «*выбітыя вокны з восені яго маці пазатыкала рознымі лахманамі і рыззём*» [6, с. 30], – хата не выклікае ніякага падазрэння ў мясцовых паліцаяў. А вось унутры ўжо паўстае іншая карціна. Гэтая хата – «лабараторыя» для падрыхтоўкі дыверсій супраць акупантаў: «*Цішкава жыллё ў гэтыя дні, мабыць, падобна да лабараторыі сярэдневяковых алхімікаў. Усюды бутэлькі і бутэлечкі, прабіркі, спіртоўкі, бляшанкі з рознымі парашкамі, кавалкі свінцу і скруткі меднага дроту*» [6, с. 29].

Не толькі тэме вайны былі прысвечаны творы І. Якаўлевіча. Тэма кахання, якая прысутнічала і ў ранейшых апавяданнях пісьменніка, стала цэнтральнай у аповесці

«Развітанне ў Кавальцах» (1974). Аповесць была навеяна аўтару «*як унутранымі пачуццямі, так у той жа меры і грамадскімі… хацелася як бы праверыць асноўныя каштоўнасці жыцця ў інтымнай сферы, у сферы кахання*» [9, с. 176].

Героі аповесці І. Навуменкі «Развітанне ў Кавальцах» – гэта вобразы беларускіх інтэлігентаў. Даследчык літаратуры В. Каваленка адзначаў, што «Пісьменнік з зайздроснай выразнасцю праз перыпетыі інтымнага жыцця вымаляваў праўдзівы сацыяльна-псіхалагічны партрэт беларускай інтэлігенцыі пасляваеннага часу» [3, с. 10].

Галоўнымі героямі твора з'яўляюцца малады студэнт-завочнік Жэня, які працуе настаўнікам у школе ў Кавальцах, і Антаніна, якая таксама ўжо мае дыплом настаўніцы. Англійскі літаратуразнаўца А. Макмілін лічыць, што персанажы аповесці, у параўнанні з героямі яго папярэдніх апавяданняў і аповесцяў на ваенную тэматыку, «*становяцца больш рэфлексіўнымі*» [1, p. 147]. З гэтай думкай нельга не пагадзіцца. Калі героі апавяданняў і аповесці на тэму вайны І. Якаўлевіча, якія мы разглядалі раней, – гэта маладыя хлопцы-падпольшчыкі, якія дзейнічаюць, змагаюцца з акупантамі, то персанажы аповесці «Развітання ў Кавальцах» – гэта ўжо мірныя жыхары пасляваеннага часу, якія паглыблены ў сябе і пастаянна аналізуюць свае думкі і перажыванні. У гэтай аповесці няма падполля, дыверсій, ворагаў-акупантаў, маладыя людзі вучацца ва ўніверсітэце, працуюць на заводзе, кахаюць.

Час, які апісваецца ў аповесці, супадае з так званай урбанізацыяй насельніцтва краіны. Моладзь імкнецца паступіць і вучыцца ў горадзе, любым шляхам «зачапіцца» там, каб не вяртацца ў вёску. Агульны партрэт дзясяцікласнікаў мастак слова падае наступным чынам: «*Дзесяцікласнікі – амаль грамадзяне. У хлопцаў – прычоскі, у дзяўчат – доўгія заплеценыя косы. Кажушка, паліточыка амаль не ўбачыш, носяць дзеці вёскі рознакаляровыя курткі з сінтэтычнага матэрыялу. Жэня Сініцкая, дачка Ганны Андрэеўны, яшчэ з дзявятага класа прыходзіць на ўрокі ў штанах*» [7, с. 89–90]. Знешні выгляд моладзі ніяк не вяжацца з вяскоўцамі. Адразу кідаецца ў вочы моцны ўплыў горада на маладых людзей. І вельмі складана растлумачыць прычыну такога масавага захаплення горадам. Прыезджы госць спрабуе разважаць аб глабальных прычынах масавага пераезду моладзі з вёскі ў горад: «*Лічыцца, што ў вёсцы не хапае культуры і таму моладзь бяжыць у горад. Але я ведаю многа прыкладаў, калі ў калгасах, саўгасах добрыя клубы, у кожнай хаце тэлевізар, але моладзь усё адно не затрымліваецца. Ёсць, мабыць, глыбейшыя прычыны, звязаныя з адносінамі да жыцця*» [7, с. 99]. І гэтая думка героя апавядання вельмі слушная. Менавіта розныя адносіны да жыцця і становяцца асноўнай прычынай масавага эміграцыі моладзі з вёскі ў горад. А яшчэ тая ж прычына не дазволіла каханню маладога настаўніка Жэні да Антаніны стаць шчаслівым і ўзаемным.

Нягледзячы на ўзаемную сімпатыю Антаніны Разумоўскай да закаханага ў яе маладога спецыяліста Жэні, яна да канца так і не змагла яго зразумець. Малады настаўнік быў блізкі да прыроды, заядлы грыбнік, любіў проста паблукаць па лесе, паслухаць яго музыку, у весцы яму было добра і спакойна. Ён быў зусім не супраць і пасля заканчэння ўніверсітэту застацца працаваць у мясцовай школе настаўнікам, калі б побач з ім была каханая дзяўчына. А вось Антаніне бліжэй быў горад. Нават большую частку свайго адпачынку яна праводзіла не ў вёсцы з бацькамі, а ў горадзе. Аднойчы Жэня прызнаецца дзяўчыне: «*Я хацеў цябе ў лесе сустрэць…*», а ў адказ атрымаў незразумелае: «*Што было б, калі б ты*

*сустрэў мяне ў лесе?*» [7, с. 105] Для маладога настаўніка лес – гэта «*сакральнае*» месца, дзе ён мог бы прызнацца каханай дзяўчыне ў сваіх пачуццях. Шмат разоў, блукаючы па ім, герой успамінаў, як прыходзіла да яго «*пушыстая дзяўчынка з тоўстымі ножкамі, заплеценай касой, вялікімі, нібы здзіўленамі вачамі*» [7, с. 105] і назірала за тым, як ён, яшчэ малы хлопец, пасвіў кароў. Але так атрымалася, што «пушыстая дзяўчынка» і Антаніна – гэта ўжо два розных чалавека. Успаміны, якія былі дарагімі і важнымі для Жэні, Антаніна не магла з ім раздзяліць: «*Нічога я не помню...*» [7, с. 105]. Гераіні твора вельмі спадабаўся сумесны з Жэняй паход у «*людны, тлумны*» рэстаран. Таму канцоўка аповесці дастаткова прадказальная: Антаніна выходзіць замуж за другога. Гэта характэрна для твораў І. Навуменкі на тэму кахання: у іх «амаль ніколі не бывае шчаслівай развязкі, таго “хэпі-энду”, які з’яўляецца, да прыкладу, абавязковым атрыбутам так званага “любоўнага рамана”. Амаль кожны твор завяршаецца тужлівай, шчымлівай нотай, матывам развітання або расчаравання», а адбываецца гэта, на думку П. В. Васючэнкі, таму, што «закаханыя героі, як правіла, інтэлігенты з абвостранай рэфлексіўнасцю, чые няўдачы, магчыма, тлумачацца тым, што яны спрабуюць зразумець душу каханай розумам, а ў пачуццях крышку ідэалізуюць сваіх абранніц, што неўзабаве прыводзіць іх да расчаравання» [2, с. 710].

І. Навуменка працягвае развіваць сваё майстэрства пейзажыста і ў гэтай аповесці. Ён сам распавядаў, што «аповесць “Развітанне ў Кавальцах” напісаў пад уражаннямі ад маляўнічай даліны ракі Іслач. Пасяліў у гэтыя мясціны сваіх герояў» [8, с. 3]. Немагчыма не заўважыць, з якім замілаваннем і цеплынёй апісваецца ў творы гэтая рака: «*А ўвогуле рачулка жывая. Яна весела булькае ўнізе, аблізваючы карэнні алешын, лазнякоў, якія навісаюць над ёй на ўсім працягу, дно яе ўслана жвірам, дробнымі каменьчыкамі, вада сцюдзёная і чыстая. Некалі рачулка ведала лепшыя часы, бо ўся багністая тарфяная лугавіна паміж двума сасновымі пагоркамі была, відаць, яе рэчышчам. Цяпер ля падножжа правага пагорка густа падняўся арэшнік, нават дубы выраслі – рэчка пачала занепадаць даўно*» [7, с. 76].

Апісанне ракі, да якой і душой і сэрцам прыкіпеў галоўны герой аповесці, не проста з’яўляецца фонам, на якім разгортваецца дзеянне. Яно сімвалізуе і дэманструе тыя змены, што адбываюцца ў прыродзе, у жыцці грамадства. Для пісьменніка знішчэнне меліяратарамі гэтай малой рачулкі дзеля дабычы торфу– гэта знішчэнне старога «*вясковага*» ладу жыцця. Для Жэні гэта сапраўдная трагедыя: «*Я быў на ўроках, калі здарылася няшчасце з рачулкай. Меліяратары прыгналі экскаватар і за нейкую гадзіну ўздоўж па лугавіне, побач з рэчкай, пракапалі глыбокую прамую канаву. Яна запоўнілася вадой, рэчка на вачах абмялела. Цяпер пад мастком ледзь цурчыць кволы ручай, рачулка адразу страціла прывабнасць: на аголеных карчах, дзеравяках вісіць ціна, сіратліва, як непатрэбныя, стаяць ля гразкага рэчышча вольхі і лозы*» [7, с. 92].

Неаднаразова І. Навуменка адзначаў, што большасць яго «апавяданняў і аповесцей, пачыналіся з нейкай унутранай, душэўнай музыкі, з настраёвых пейзажных карцін» [8, с. 3]. «*Музыка*» альбо «*музыкальнасць*» як спецыфічны сродак мастацкай выразнасці характэрна і для яго аповесці «Развітанне ў Кавальцах». У якасці прыклада можна прывесці апісанне прыроды, якое галоўны герой сам назваў «*музыкай адзіноты*»: «*Будзе шастаць пад зімовымі вятрамі голле старой ліпы, глуха шумець сасоннік, але ўсё гэта мне прыдзецца слухаць без Анта-*

*ніны. Музыка адзіноты. Замерзне рачулка, якая цячэ пад вокнамі яе дома, зімой між аснежаных берагоў і цёмных сосен зробіцца зусім непрыкуметнай, але на мастку я буду стаяць адзін*» [7, с. 89].

Меладычная танальнасць, якая праходзіць праз усю аповесць, залежыць ад жыццёвага матэрыялу і нараджаецца яго спецыфікай.

Жанр аповесці ў мастацкай спадчыне І. Навуменкі быў «пераходным» этапам ад апавядання да рамана. Падчас працы над Зборам твораў Івана Навуменкі ў 10 тамах даследчыца І. Баўтрэль выявіла, што аповесці «Снежань» і «Мой сябар Пятрусь» амаль без змен увайшлі ў раман «Сасна пры дарозе» [5, с. 139]. Гэтая акалічнасць яшчэ раз пацвярджае выснову, што І. Якаўлевіч разглядаў апаваданні і аповесці і як самастойныя творы, і як чарнавікі да больш разгорнутых жанравых форм.

ЛІТАРАТУРА


1. *McMillin, A.* Die Literatur der Weissrussen = A history of Byelorussian literature from its origin to the present day / A. McMillin. – Giessen : Schmitz, 1977. – 449 p.

2. *Васючэнка, П.* Іван Навуменка / П. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 3. – С. 689–713.

3. *Каваленка, В.* І радасць, і смутак, і боль… / В. Каваленка // Навуменка, І. Выбраныя творы : у 2 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1 : Апавяданні. Аповесці. – С. 5–12.

4. *Клімуць, Я.* І. Вобраз маладога пакалення ў ваеннай прозе І. Навуменкі / Я. І. Клімуць // Творчасць Івана Навуменкі : славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : матэрыялы Рэсп. навук. канф. (да 85-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі), Мінск, 16 лют. 2010 г. / Ін-т мовы і літ. ім. Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2010. – С. 244–247.

5. Кулуарамі творчай майстэрні Івана Навуменкі / С. С. Лаўшук [і інш.] ; навук. рэд. : А. А. Манкевіч ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 333 с.

6. *Навуменка, І.* Збор твораў : у 6 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1981. – Т. 1 : Аповесці і апавяданні. – 559 с.

7. *Навуменка, І.* Збор твораў : у 6 т. / І. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 1982. – Т. 2 : Аповесці і апавяданні. – 558 с.

8. *Навуменка, І.* Знайсці свайго героя / І. Навуменка; гутарыў У. Марук // Звязда. – 1985. – 16 лют. – С. 3.

9. *Навуменка, І. Я.* Збор твораў : у 10 т. / І. Я. Навуменка ; падрыхт. тэкстаў, камент. і пасляcл. Н. Пыско. – Мінск : Маст. літ., 2017. – Т. 10 : П'еса, вершы, інтэрв'ю, анкеты, выступленні, водзывы на дысертацыі, некралогі, аўтабіяграфія, успаміны, дзённікавыя запісы, лісты. – 989 с.